# У розных жанрах

**Артур Вольскі (сапраўднае прозвішча Вольскі-Зэйдэль), з дня нараджэння якога 23 верасня споўнілася 100 гадоў, нарадзіўся ў мястэчку Койданава (сённяшні Дзяржынск Мінскай вобласці) у сям'і пісьменніка Віталя Вольскага. У час вучобы ў 25-й Мінскай узорнай чыгуначнай беларускай школе імя А. Чарвякова захапіўся літаратурай і маляваннем. Там выкладаў гісторыю і геаграфію Іван Фёдараў (будучы пісьменнік Янка Маўр), які выхоўваў у вучняў любоў да роднай мовы, знаёміў з культурнай спадчынай нашай краіны. У 1938 годзе А. Вольскі паступіў у Віцебскае народнае мастацкае вучылішча. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, эвакуіраваўся ў г. Уральск, дзе працаваў мастаком у Беларускім дзяржаўным тэатры імя Якуба Коласа. Прызваны ў Чырвоную Армію ў 1942-м. Служыў на флоце на Далёкім Усходзе. Удзельнічаў у баях супраць Японіі, быў боцманам, мінёрам, ваенным журналістам. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалём «За баявыя заслугі».**

Пасля дэмабілізацыі ў 1952 годзе вярнуўся ў Мінск і заняўся журналісцкай дзейнасцю. Працаваў у газеце «Чырвоная змена», часопісах «Бярозка» і «Вясёлка». У 1962-м скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1963 да 1966 г. і ў 1992—2000 гг. загадваў літаратурна-педагагічнай часткай Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, у 1966—1978 гг. быў яго дырэктарам. У 1978—1979 гг. дырэктар Дома літаратара, з 1980-га з'яўляўся літкансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (з 1955 г. быў яго членам). У 1981—1984 гг. працаваў старшым рэдактарам выдавецтва «Юнацтва». Актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю: уваходзіў у прэзідыум Беларускага тэатральнага таварыства і прэзідыум Савецкага цэнтра Міжнароднай асацыяцыі дзеячаў тэатра для дзяцей і юнацтва, быў членам праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Першыя творы А. Вольскага — апавяданне «Воўчае гняздо» (1937) і верш «Калі б быў бы я паэтам» (1939) — былі апублікаваны ў часопісе «Іскры Ільіча». У зборніках паэзіі «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982) значнае месца адведзена нялёгкай службе і подзвігам савецкіх маракоў. Шмат вершаў прысвяціў духоўнаму адраджэнню чалавека. Ад кнігі да кнігі расло яго майстэрства. Найбольш ярка яно праявілася ў творах для дзяцей. Зборнікі «Маленькім сябрам» (1955), «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабярuся да нябёс» (1984),



*Артур Вольскі.*

«Ад А да Я — прафесія мая» (1987), «Хлеб — усяму галава» (1989) і іншыя пашыраюць кругагляд дзяцей, вучаць працавітасці, паслухмянасці, узаемадапамозе, сяброўству, дабрыні, шчырасці, павазе да старэйшых. Талент А. Вольскага выразна праявіўся ва ўменні арыгінальнымі сюжэтамі і вобразамі ўнікнуць у клопаты дзіцяці, гаварыць яму зразумела, простымі словамі аб праблемах жыцця, бачыць навакольны свет вачыма хлопчыкаў і дзяўчынак, з псіхалагічнай дакладнасцю перадаваць асаблівасці ўспрымання юнымі чытачамі новага і незнаёмага.

Плённа працаваў і ў жанры драматургіі. У суаўтарстве з П. Макалём напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі» (1959) і «Марынка-крапіўніца» (1962). Разам з Э. Доўнарам — кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка» (тэлеверсія ў дзвюх серыях — «Пастух Янка», фільм зняты ў 1976 г.). Аўтар п'ес-казак «Сцяпан — вялікі пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семянякам і пастаўлена на сцэне Мінскага тэатра музычнай камеды — першая беларуская аперэта для дзяцей), «Тры Іваны — тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989). На Беларускім тэлебачанні пастаўлены спектаклі «Апошняя ноч Алаізы» (1986), «Водар папараці» (1989). Па творах А. Вольскага было знята некалькі мультфільмаў, найбольш вядомыя сярод іх — «Про кота Васю и охотничью котовасию» і «Мая мама — чараўніца». Займаўся і перакладамі твораў рускіх і замежных аўтараў. Сярод іх — «Прыгоды Бураціны» А. Талстога, «Чайка» А. Чэхава, «Голы кароль» Я. Шварца, «Маленькі лорд Фаўнтлярой» Ф. Бернет і інш.

Памёр Артур Вольскі 5 верасня 2002 года. Ён узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі, граматамі Вярхоўнага Савета БССР. З'яўляецца лаўрэатам прэміі імя Янкі Маўра.

**Кацярына ВАРАНЬКО,**
**вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**